# Творчая дзейнасць дзіцячага ўзорнага калектыву ганчарнага мастацтва “Глечыкі” Цэнтра рамёстваў п.Глуша Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці, які курыруе народны майстар Рэспублікі Беларусь Ю.І.Боўда

Ганчарства – вытворчасць керамічных вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладного прызначэння з гліны.

На бабруйскай зямлі здаўна займаліся керамікай і ганчарствам, і рамяство гэтае перадавалася ў спадчыну з пакалення ў пакаленне. З цягам часу гэты напрамак рамяства страціў папулярнасць і прыйшоў у заняпад.

Ганчарства пачало адраджацца і набываць ўсё большую папулярнасць сярод прызнаных майстроў-керамістаў і падрастаючага пакалення дзякуючы таленавітым і апантаным майстрам, такім як Ламака П.М., Боўда Ю.І., Арлоў А.В.

Для далучэння дзяцей і падлеткаў да народных традыцыйных рамёстваў беларусаў, адным з якіх з’яўляецца ганчарства, у п.Глуша Бабруйскага раёна ў 1999 годзе пры Цэнтры рамёстваў быў створаны дзіцячы гурток па ганчарству. Гэта адначасова і майстэрня, і школа для тых, хто жадае авалодаць сакрэтамі старых майстроў.

Арганізатарам і кіраўнікам гуртка з'яўляецца Арлоў Аляксандр Васільевіч, дарэчы навучэнец Ю.І. Боўды. Вось ўжо больш за 10 год існуе добрае творчае супрацоўніцтва дзіцячага калектыва з майстрам.

Юрый Іванавіч з задавальненнем перадае юным ганчарам сакрэты свайго майстэрства: ён валодае старымі тэхналогіямі чорназадымленай і абварной керамікі, сакрэтамі абпалу, абвару, васкавання, захоўвае і адраджае традыцыі ганчарства Бабруйшчыны.

Дзеці, а іх у гуртку 15 чалавек, з задавальненнем пасцігаюць таямніцы майстэрства работы з глінай. Навучанне праходзіць у маляўнічым куце Бабруйскага раёна ў п.Глуша, дзе знаходзіцца “хата ганчара”.

Падлеткі, сярод якіх ёсць і дзяўчынкі, знаёмяцца з гісторыяй ўзнікнення ганчарства на Бабруйшчыне, вучацца знаходзіць “копанкі”, нарыхтоўваць гліну, паступова пачынаюць “адчуваць” гліну пальцамі рук.

Працэс навучэння пабудаваны на аснове рэгіянальных народных традыцый у кераміцы. На занятках удзельнікі не толькі набываюць навыкі ганчарнай справы: лепкі, скульптуры, але і спрабуюць свае сілы ў кампазіцыі, роспісу, дэкору. Ствараючы ганчарныя вырабы дзеці маюць

магчымасць развіваць свае мастацкія здольнасці, пашыраць творчую фантазію.

Калектыў гурта “Глечыкі” з’яўляецца пастаянным удзельнікам раённых, гарадскіх і абласных святаў і выстаў.

Неаднаразова юныя ганчары гуртка “Глечыкі” станавіліся пераможцамі на Міжнародным фестывале дзіцячай творчасці “Залатая пчолка” (г.Клімавічы). У 2003 годзе юныя удзельнікі Мікалай Рослік, Віталь Пашчанка, Ала Бязручка, Юрый Шыла прадстаўлялі калектыў на Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці “Залатая пчолка”. Журы фестывалю высока ацаніла свістулькі і свяцільнікі Юрыя Шылы, які атрымаў дыплом у намінацыі “Выстава-студыя “Акадэмія дзіцячай творчасці”. У 2007 год на гэтым фестывалі дыплом II ступені атрымаў Ерамееў Аляксандр;а ў 2008 год – дыпломы I і III ступені атрымалі Арлоў Уладзімір і Дыба Павел.

У 2008 годзе ў п. Глуша Бабруйскага раёна праводзіўся абласны дзіцячы пленэр па кераміцы, на які сабраліся ўдзельнікі гурткоў ганчарства, а таксама майстры-керамісты з усёй вобласці.

Майстры-ганчары Ю.І.Боўда, В.І.Боўда, А.В.Арлоў, Д.В.Паляшчук давалі майстар-клас удзельнікам пленэра, а падлеткі і моладзь з захапленнем назіралі і набіраліся вопыту ў рабоце на ганчарным крузе, лепцы мелкай пластыкі.

Вельмі ўразілі ўдзельнікаў пленэра печы для абпалу і абвару, якія зрабілі сваімі рукамі майстры-ганчары Бабруйшчыны пад кіраўніцтвам Ю.І.Боўды. Удзельнікі пленэра вучыліся загружаць вырабы ў печы, распальваць іх, вымаць астыўшыя гаршкі і глякі.

Беларускім тэлебачаннем, тэлеканалам “Магілёў” былі зняты дакументальныя фільмы пра ўзорны дзіцячы калектыў “Глечыкі”, пра творчасць майстроў-ганчароў Бабруйскага раёна, якія пад кіраўніцтвам народнага майстра Рэспублікі Беларусь зберагаюць, адраджаюць тэхналогію ганчарных вырабаў Бабруйшчыны і перадаюць яе падрастаючаму пакаленню.

Праходзяцць гады, адны ўдзельнікі пакідаюць гурток, на іх месца прыходзяць іншыя, каб навучыцца рабіць сваімі рукамі цуды з гліны. І ўсе яны помняць не толькі заняткі па малюнку, лепцы, скульптуры, але і тую школу майстэрства, якую яны атрымалі.

Ланцужок не павінен перапыняцца. Традыцыя не павінна памерці.

Ганчарства на Бабруйшчыне ніколі не знікне, яно будзе развівацца і надалей: дзеці і падлеткі, якія пераймаюць тэхналогію ганчарных вырабаў, будуць працягваць справу сваіх настаўнікаў-майстроў.